**Н.М. Борсук**
Брэст, БрДТУ

## «КОЖНЫ НІБЫ САМ САБОЮ СТАЎ»: ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ ВА ЎМОВАХ НЕБЯСПЕКІ (ПА РАМАНЕ У. ГНІЛАМЁДАВА «ВАЙНА»)

Беларускія пісьменнікі – М. Лынькоў, І. Мележ, К. Губарэвіч, К. Чорны, І. Шамякін, Я. Брыль, А. Адамовіч, У. Калеснік, В. Казько, А. Філатаў, І. Навуменка, В. Быкаў і інш. – дасягнулі трывалых поспехаў у распрацоўцы тэмы вайны.

У. Гніламёдаў паспяхова паглыбляе традыцыі папярэднікаў. Адначасова празаік, аб чым сведчыць яго раман «Вайна», па-новаму глянуў на гісторыю акупацыі Заходняй Беларусі. Героі Уладзіміра Васільевіча Гніламёдава – мірныя людзі, пераважна сяляне. Нацярпеліся яны і ад фашыстаў, і ад партызан, і ад марадзёраў. І ўсіх трэба было накарміць, апрануць. Найчасцей вяскоўцаў аб гэтым і не прасілі. Уварвуцца ў хату няпрошаныя госці, усё забяруць падчыстую, і добра, калі пойдуць з мірам. Нярэдка за імі ўсё гарэла: «Ну што ж, справа зроблена. Як і планавалі. А што жанчына, дык што ж, усялякае здараецца», – падвёў вынікі выкананага партызанскага задання Калеснікаў [1, с. 412].

Навізна твора, на думку літаратуразнаўцы Т. Студзенка, заключаецца таксама ў адсутнасці класічнага задору і пафасу – “За Радзіму, за Сталіна!”, «агульнай ганьбы савецкасці, сталінізму» [2, с. 106]. У. Гніламёдаў перакананы, што «захаваць уласнае жыццё ў страшэнных абставінах не менш годная і цяжкая справа, чым памерці са зброяй у руках, абараняючы іншых. Калі, зразумела, выжываючы, чалавек не становіцца нягоднікам, здраднікам, забойцам (22.06.1975)» [3, с. 118].

У ходзе вырашэння акрэсленай задачы пісьменнік звяртае ўвагу чытача на наступныя пытанні: ці не робяцца людзі бязлітаснымі адзін да аднаго, абыякавымі да жыцця; ці не вынішчаецца ў іх дабро, калі яны доўгі час бачаць гвалт над чалавечым жыццём?; якія пачуцці выклікае вайна ў беларусаў – пагарду, злосць ці вялікую павагу да жыцця?; ці прававерна сцвярджанне, што Вялікая Айчынная вайна – гэта была яшчэ і «дамовая вайна»?

Заслуга У. Гніламёдава бачыцца нам яшчэ і ў тым, што пісьменнік здолеў паказаць трагедыю вайны вачыма сямнаццацігадовых юнакоў і дзяўчат, боль «страчанага пакалення», спробу маладых людзей стварыць для сябе «ў часе, вывіхнуўшым сустаў» (выраз нямецкага пісьменніка Рэмарка), свой маленькі свет, у нечым цынічны, у нечым забаўны, а ў нечым шчымліва-чысты свет сапраўднага сяброўства і адчайнага кахання.

Героі рамана «Вайна» не былі ўпэнены, што дажывуць да «времени жить», але, выхаваныя на старажытным ліцвінскім прынцыпе «Фальварак – гэта незалежнасць», сяляне і ў небяспечныя ваенныя часы трымаліся гаспадаркі. Па перакананні У. Гніламёдава, ніштo не здольна знішчыць сапраўднага гаспадара, спыніць селяніна ў яго працоўным калаўроце.

Чытач мае магчымасць пераканацца, што раманіст прытрымліваецца пэўнай пазіцыі, згодна якой чалавек становіцца сам сабою, калі набліжаецца небяспека. Гэтае перакананне пісьменнік укладвае ў вусны героя твора Павала Гальяша: «Усе мы сталі іншыя, кожны нібы сам сабою стаў. Так здараецца, калі небяспека блізка…» [1, с. 43]. Спынімся на акрэсленай праблеме.

У. Гніламёдаў з псіхалагічнай дакладнасцю прасочвае слушнасць думкі, якую ў свой час выказаў брэсцкі праваслаўны епіскап Пацей: вайна «выварочвае грунт» пад нагамі людзей. На прыкладзе паводзін Свісціяна, Маркела пісьменнік паказвае тып людзей, якія і да вайны слаба адчувалі маральны грунт пад сабою, а ў часы ваеннага ліхалецця наогул яго пазбавіліся. Мясцовае насельніцтва такімі, хто «паводзіў сябе ў залежнасці ад сітуацыі і характару», пагарджала, але ж і пабойвалася. Цяжка аднавяскоўцам было зразумець спалучэнне такіх рыс характару ў натуры Свісціяна, як рухавасць, рызыкоўнасць, прыстасавальніцтва, жорсткасць. З прыходам фашыстаў Свісціян быў перакананы, што не прападзе. Ён заняўся бізнесам: у Брэсце збываў сала, мяса, садавіну, агародніну – прадукты, а з горада вёз скураны абутак, шарсцяныя адрэзы, мыла, цыгарэты. Даведаўшыся, што немцы за яго занятак кантрабандай спалілі хату з усёй гаспадаркай, забілі жонку, Свісціян не адчуваў сябе вінаватым: «На пачатку трэба падумаць, як самому быць, куды прыткнуцца». Доўгі час бадзяўся па лесе, зрабіў схоў, халодныя і небяспечныя часы праседзеў у клуні пpускаўскага прыяцеля Хвядзюшкі Шпунта, зрабіўшы глыбокую і звілістую нару ў застаронку, у сене. Днём ляжаў у нары, а ноччу выходзіў на паляванне, прыхапіўшы дзеля ўстрашэння землякоў сваю СВТ. Перапалоханыя вяскоўцы дзяліліся з «нечаканым прыхаднем» сваімі запасамі: добротны кужушок прыдбаў Свісціян у Макара, святочныя боты і гадзіннік у Мікалая з Пакупчык; не пагрэбаваў і Васілёвым вясельным касцюмам.

Свісціян належыць да ліку тых, хто імкнуўся давесці рызыкоўную справу да лагічнага завяршэння. У партызаны ён падаўся не па ідэйным перакананні. Для Свісціяна патрэбна было «хоць нейкае прыкрыццё» для занятка грабежніцтвам, думаў ён і пра апраўданне сваім бадзянням па лесе ў пасляваенны час. Тым больш што абстаноўка на фронце змянілася, даходзілі чуткі пра перамогу савецкіх войск пад Масквой, Сталінградам. Трапную ацэнку партызанскім паходам Свісціяна дае Хрысан:

Партызаніць, ходзяць разам з Маркелам. Каморы чысцяць, кажухі забіраюць, гадзіннікі. Кажуць, Аўстрыйца гэта яны ахаладзілі» [1, с. 553].

Назіраючы за паводзінамі Свісціяна, Васіль Кужаль тонка заўважае: «Гэты чалавек краю не знае» [3, с. 429]. Выказанае вышэй меркаванне У. Гніламёдаў перадае праз знешні выгляд героя. Пісьменнік канцэнтруе ўвагу на клыкаватых зубах Свісціяна, якія ён выскаляў у хвіліну самалюбавання сваёй кемлівасцю; глюгаватым носе; калматых бровах; твары, што нагадваў сціснуты кулак; манеры апранацца («лета, а яны, адзін і другі, у кажушках, падперазаныя папружкамі, каўняры паднятыя, а шапкі ў абодвух насунутыя на самыя бровы» [1, с. 591]) – ва ўсім гэтым праглядаліся прыхаваная пагроза, адчуванне спакаранасці, самаўпэненасць, прыстасавальніцтва Свісціяна да любой сітуацыі, якую ён здольны быў павярнуць сабе на карысць. І як ні дзіўна, але ж Свісціян быў перакананы, што на ўсё гэта ён мае права: «Я ж не па сваёй волі нарадзіўся, не па сваім жаданні на гэтым свеце сярод вас апынуўся. А калі так сталася, дык дайце мне прапітанне! Апраніце мяне, абуйце, чалавекам зрабіце!» [1, с. 252].

Як бачна, Свісціян усведамляе вайну як падзею лёсаносную. Для яго гэта своеасаблівы шлях разбагацець. Тым больш што вопыт у «Гусятніка» быў (такое крыўднае прозвішча замацавалася за Свісціянам з савецкіх часоў, бо краў гусей у аднавяскоўцаў), а каб не адчуваць беспрытульнасць, адзіноту, успомніў пра Маркела Божыка. Пры паляках яны абодва займаліся рэкетам у Камянцы на базары. Па-мясцоваму іх называлі збуічамі 247. «Гаспадары акругі» дзейнічалі нахрапіста, жорстка, па праву мацнейшага: каму аглоблі паламаюць, каму гужы абрэжуць. Не змяніўся стыль іх паводзін і падчас вайны. Груба абыходзіцца Свісціян з людзьмі, якія яго і іншых партызан кармілі, давалі прытулак. Паплечнікі па зброі не давяралі свайму «баявому таварышу», але ж ніхто з атрада нават не паспрабаваў спыніць агрэсію Свісціяна. Партызан Дзімка просіць прабачэння ў хутаранцаў за грубыя паводзіны Маркела і яго сябра. Камандзір партызанскага атрада, уздыхнуў, нічога не сказаўшы даведаўшыся, што Свісціян забіў іх праваднік па сваёй асабістай ініцыятыве, бо палічыў яго здраднікам (яму ў галаву не магло прыйсці, што гэта збег абставін і атрад выпадкова нарваўся на засаду). На ўсё ў героя рамана ёсць апраўданне: «так распарадзіўся лёс. Нічога не зробіш, тут – хто каго» [1, с. 487]; «ваюю па-народнаму, па-мужыцку, як умею» [1, с. 482]. Больш за тое, упаўнаважаны Афінагенаў спыняецца на кандыдатуры Свісціяна, калі з'яўляецца патрэба пашарсціць сяго-таго, бо разумее, што гэты «гора-актывіст» выканае загад начальства і нават перавыканае і пытанні задаваць не будзе, бо заўжды кіруецца прынцыпам «хай загіне два невінаватыя, у канцы канцоў, чым адзін здраднік у жывых застанецца» [1, с. 489].

Такім чынам, для Свісціяна і яму падобных вайна – гэта спроба паказаць сваю значнасць, сцвердзіць сваю сілу, перавагу, а таксама адзін з магчымых сродкаў палічыцца з нядобразычліўцамі, лішнімі сведкамі яго несумленных учынкаў. Самае страшнае, што гэтага Свісціян не хавае. «Я ж табе абяцаў, што палічымся!» – заяўляе ён Васілю [1, с. 592]. Нават калі адбываў пакаранне ў славутым на ўсю Польшчу Свентым Кшыжы за грабежніцтва, Свісціян цешыў сябе жаданнем помсты, марыў памяняцца з турэмшчыкамі месцамі: «Пахлябталі б вы баланды, а мы вас – гумовым кіем!» [1, с. 17].

Сімвалічнай бачыцца сустрэча героя рамана з ваўком галоднай ранняй вясной. Пры выглядзе чалавека драпежнік натапырыў поўсць, а потым павярнуўся, падняўся на бераг і, не азіраючыся, падаўся ў лес. Свісціян праводзіў яго поглядам. Воўк бяжыць ад чалавека. Наватарскае выкарыстанне рэмінісцэнцыі з рамана В. Карамазава «Пушча» дазваляе выявіць сапраўдную сутнасць Свісціяна. Звярыны пачатак, што прысутнічае ў характары героя рамана, знішчае ў чалавеку самае лепшае – сваяцтва душ. Свісціян гатовы забіць нават свайго вернага Маркела, які ва ўсім яго падтрымліваў, бязгучна крочыў за ім па жыцці, быў выканаўцам яго волі. Думка аб забойстве сябра прыйшла ў галаву Свісціяна ў тую хвіліну, калі ён з вуснаў Маркела пачуў размову пра літасць у адносінах да жонкі, дзяцей здрадніка Аўстрыйца. У такой сітуацыі Маркел для Свісціяна лішні сведка. «А нашто лішні сведак?..» [1, с. 490].

Тым не менш і вобраз Маркела не выклікае спачування, таму што абыякавасць да свайго лёсу і лёсу іншых людзей, адсутнасць пэўнай акрэсленай пазіцыі нараджаюць бязродных паслугачоў, ад якіх, як сцвярджае пісьменнік, сыходзіць большая небяспека, чым ад ворагаў. Бачна, што Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў прытрымліваецца пэўнай пазіцыі, згодна якой чалавек становіцца сам сабою, калі набліжаецца небяспека. Гэтае перакананне пісьменнік укладвае ў вусны героя рамана Павала Гальяша: «Усе мы сталі іншыя, кожны нібы сам сабою стаў. Так здараецца, калі небяспека блізка…» [1, с. 43].

На старонках твора У. Гніламёдаў шчыра паказвае, што Свісціян, Маркел – гэта, на жаль, не адзінкавыя прадстаўнікі мясцовага насельніцтва, пра якіх у народзе кажуць: «Ад сярдзітага не чакай розуму». Для нямецкага паслугача, вясковага старасты Хвядзюшкі крок да ўлады – гэта таксама своеасаблівая помста за тое, што пры Саветах яго не заўважалі, недаацэньвалі. Крыўду Хвядзюшка праглынуў, але затаіўся. Сабе ў памочнікі ён адбірае паслухмяных дарадчыкаў, якія не абгавораць, не падседзяць, не ссунуць з крэсла. Хвядзюшку, безумоўна, не хапае рухавасці, дальнабачнасці Свісціяна, але ж незадаволенасці лёсам, злосці на людзей, абставіны ў яго залішне. У выніку Хвядзюшка становіцца

паслухмяным вінцікам у руках Хрысана, Цішкі Пахолкі, з лёгкай рукі якіх былі вызначаны кандыдаты для баранавання міннага поля. Гэты факт, як і многія іншыя, узятыя пісьменнікам з сапраўднага жыцця і ўзгаданыя на старонках рамана, дапамагае творцу паказаць вайну ва ўсёй праўдзівасці перажытага і выпакутаванага народам. Так, на старонках кнігі «З таго, што помніцца і што думаецца…» Уладзімір Васільевіч успамінае, як праз родную вёску Кругель праходзіла шматлікае партызанскае злучэнне пад камандаваннем генерала-каўпакаўца Пятра Вяршыгары [4, с. 11]. Гэта было ў сакавіку 1944 года. Смелыя, спрактыкаваныя ваякі, каб немцы іх не дагналі, паставілі на Камянецкім гасцінцы міны. Злучэнне прайшло, а міны засталіся. Бывала, падрываліся на іх сялянскія фурманкі. А аднойчы падарвалася нямецкая аўтамашына. Нікога з немцаў не забіла, магчыма, таму ўцалела і вёска, у якой нарадзіўся пісьменнік. Замест таго, каб прыслаць сапёраў, немцы загадалі сялянам баранаваць гасцінец.

Як сведчыць вышэйправедзены аналіз, У. Гніламёдаў з болем канстатуе, што Вялікая Айчынная вайна – гэта была яшчэ і «дамовая вайна» паміж сваімі. Такі факт цяжка было прызнаць маладым людзям («чырвоных і белых цяпер няма, а свой свайго чапаць не будзе. Свой ёсць свой, а вораг – вораг, з ворагам трэба змагацца» [1, с. 445]), хаця і былі яны сведкамі амаральных учынкаў аднавяскоўцаў. Тым не менш старэйшае пакаленне, характар якога, светапогляд фарміраваліся на скрыжалях гісторыі, выразна ўсведамляла стомленасць беларусаў як нацыі, заўважала адсутнасць у іх нейкай дзелавітасці, дзейнасці, разваротлівасці. Тлумачэнне гэтаму нашы продкі бачылі не ў войнах, у якіх кожны раз трэць народа гінула (хаця і гэты факт меў, безумоўна, месца), а ў сварках паміж сваімі.

Нягледзячы на тое, што беларускія сем'і жылі ў неспакоі і трывогах у даваенны час, з адчуваннем страху, усеабдымнага, атупляючага ў перыяд ваеннага ліхалецця, усё ж такі жыць яны не стаміліся. Лявон Кужаль, Васіль, Якаў Арыстархавіч, Кузёмка, Фёкла, Косця Хлябіч і інш. прадстаюць перад намі як носьбіты пачаткаў міласэрнасці, дабрыні, самаахвярнасці. Паводзіны гэтых людзей дапамагаюць нам асэнсаваць значэнне прыказкі, якая добра была вядома родным пісьменніка: людзі, як той посуд, з адной гліны, але розныя.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Гніламёдаў, У. Вайна : раман / У. Гніламёдаў. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 628 с.

2. Студзенка, Т. Сем гадоў у ЦК. Раманізаваная аўтабіяграфія Уладзіміра Гніламёдава / Т. Студзенка // Беларус. думка. – 2015. – № 12. – С. 103–106.

3. Гарадніцкі, Я. Вучоныя Беларусі: У. В. Гніламёдаў (да 75-годдзя з дня нараджэння) / Я. Гарадніцкі // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2013. – № 1. – С. 117–120.

4. Гніламёдаў, У. «Заставацца сабой...» / У. Гніламёдаў; уклад. М. Мікуліч. – Мінск : Четыре четверти, 2012. – 574 с.